✓Да Міжнароднага дня роднай мовы **21 лютага** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Гадзіна мовы»**. На ёй упершыню прадстаўлены 7 мадэляў гадзіннікаў лімітаванай калекцыі Мінскага гадзіннікавага завода «Мова», выпушчаныя ў 2019 – 2022 гг. Апошнія рэлізы калекцыі прысвечаны народнаму паэту Беларусі Пімену Панчанку з нагоды 105-годдзя з дня яго нараджэння. За аснову дызайну быў абраны першы зборнік вершаў паэта – «Упэўненасць» 1938 г., у якім усхваляецца хараство і багацце роднай зямлі. На адкрыцці выставы прысутнічалі ўнучка Пімена Панчанкі – Кацярына Андрэеўна Панчанка, дызайнеры і аўтары калекцыі «Мова» з Мінскага гадзіннікавага завода.

Экспазіцыя будзе працаваць да 21 сакавіка.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі | Мінскі гадзіннікавы завод

ВЫСТАВА

# «ГАДЗІНА МОВЫ»

21 лютага — 21 сакавіка

адкрыццё а 16-й гадзіне

**Музей кнігі**




Нацыянальная бібліятэка Беларусі   Пр. Незалежнасці, 116   Тэлефон (8 017) 293 27 81